***Громаў, С.А.***
*студэнт 4 курса*
*Навуковы кіраўнік: А.М. Назаранка*

# ДАКУМЕНТАВАННЕ ДЗЕЙНАСЦІ РАДЫ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ Ў 1919–1921 ГГ.

Першая Сусветная вайна выклікала імклівае развіццё ідэй нацыянальнага самавызначэння народаў Расійскай Імперыі. Ужо ў 1917 годзе гэтыя ідэі атрымалі рэальнае ажыццяўленне ў з'яўленні шэрагу новых дзяржаўных утварэнняў. У пачатку сакавіка 1917 г. у Кіеве была сфарміравана Украінская Цэнтральная Рада, якая выказалася за пераўтварэнне Расійскай Імперыі ў дэмакратычную федэратыўную рэспубліку. Створаны ў сакавіку 1917 года Літоўскі нацыянальны савет выказаўся за стварэнне літоўскай адміністрацыйнай адзінкі. За ўтварэнне аўтаномнай цэласнай адзінкі "Латвія" выказаўся ў сакавіку 1917 г. Паўднёва-Відземскі земскі з'езд у горадзе Вальмар. Аб'ектыўным ходам развіцця падзей было пастаўлена пытанне пра месца ў будучай федэрацыі і беларускага народа.

Як вынік развіцця беларускага руху, у канцы 1917 г. склікаецца Першы Усебеларускі з'езд, які прывёў да абвяшчэння першай беларускай незалежнай дзяржавы – Беларускай Народнай Рэспублікі (далей – БНР) – і стварэння яе кіруючых органаў: Рады БНР і Народнага Сакратарыяту. Аднак паўнавартаснаму функцыянаванню цэнтральных органаў і ўстаноў БНР заміналі шматлікія фактары – частая змена геапалітычнай абстаноўкі, акупацыя тэрыторыі Беларусі войскамі іншых дзяржаў, прэтэнзіі на беларускую тэрыторыю практычна ўсіх суседзяў, пагроза арышту акупацыйнымі ўладамі дзеячоў БНР, дзейнасць у эміграцыі, расколы і канфлікты ў саміх органах і ўстановах БНР.

Значнасць крыніцазнаўчага і дакументазнаўчага вывучэння крыніц па гісторыі дадзенага этапу станаўлення беларускай дзяржаўнасці, роўна як і разгляду асобных пытанняў дзейнасці БНР у рэчышчы гісторыі дзяржаўных устаноў, абумовілі пастаноўку задачы выяўлення і дакументазнаўчай характарыстыкі асноўных відаў дакументаў, што ўтварыліся ў дзейнасці Рады БНР у 1919–1921 гг.

Самымі распаўсюджанымі (з захаваўшыхся) дакументамі Рады БНР за перыяд 1919–1921 гг. з'яўляліся дакументы фінансавай справаздачнасці, якія былі створаны ў працэсе дзейнасці Цэнтральнай Касы Найвышэйшай Рады БНР. У Літоўскім Цэнтральным Дзяржаўным архіве (далей – ЛЦДА) захоўваецца шэраг фінансавых дакументаў за

1920 год [1], асноўная маса якіх – хадайніцтвы ў Цэнтральную Касу і распіскі ў атрыманні з яе грошай.

Значную частку захаваўшыхся дакументаў па дзейнасці Рады БНР за 1919–1921 гг. складаюць пратаколы пасяджэнняў Рады, прэзідыуму Рады, сумесных нарад Прэзідыуму Рады БНР і Рады Народных Міністраў, і выпіскі з іх. У 582-м фондзе ЛЦДА захоўваецца 3 пратаколы сходу Найвышэйшай Рады БНР (копіі) [2], 3 выпіскі з пратаколаў (1 выпіска з пратакола сходу Рады БНР ад 12.11.1919 [3], 2 выпіскі з пратакола №2 сходу Найвышэйшай Рады БНР ад 16.12.1919 [4]), 3 копіі праткола надзвычайнага сходу Рады БНР ад 13.12.1919 [5], пратакол нарады Прэзідыуму Рады БНР і Рады Народных Міністраў БНР ад 30.05.1920 – 31.05.1920 і копія пратакола пасяджэння Прэзідыуму Рады БНР ад 01.10.1920.

Пэўную цікавасць для даследавання справаводства Рады БНР у 1919–1921 гг. уяўляюць упаўнаважанні (граматы) Найвышэйшай Рады БНР весці перамовы, падпісываць дамовы, кіраваць дэлегацыяй і інш. У 582-м фондзе ЛЦДА захоўваецца 2 асобнікі ўпаўнаважання Найвышэйшай Рады БНР Антону Луцкевічу ад 15.01.1920 "весці перамовы з чужаземнымі ўрадамі ў справах нацыянальнае абароны, падпісваць пазыкі, атрымліваць іх на рукі, заключаць гаспадарчыя ўмовы" [6], грамата Найвышэйшай Рады БНР Браніславу Тарашкевічу ад 19.01.1921 у справе прызначэння яго Старшынёй Дэлегацыі БНР [7].

Асобную групу складаюць выходныя дакументы – лісты і паведамленні Прэзідыума Рады БНР, Найвышэйшай Рады БНР, а таксама Старшыні Рады БНР. На сённяшні дзень даступнымі для навуковага ўжытку зяўляюцца суправаджальны ліст Прэзідыума Рады БНР Старшыні Рады народных Міністраў БНР В. Ластоўскаму ад 09.10.1920, дасланы з пратаколам пасяджэння Прэзідыума Рады БНР ад 01.10.1920, хадайніцтва Найвышэйшай Рады БНР перад Цэнтральнай Касай БНР за 23.06.1920 аб выдачы на рукі сябра Рады А. Уласава 63.000 польскіх марак, а таксама даручэнне Прэзідыума Рады БНР прадстаўніку БНР у Рэвелю А. Маркевічу "вясьці размовы з прэдстаунікамі Расейскаго Радянскаго Ураду" ад 15.04.1920 [8].

Аналіз сямі захаваўшыхся хадайніцтваў аб выдачы грошай дазваляе казаць аб наяўнасці ўніфікаванага фармуляра дадзенага віда дакумента. Звычайна хадайніцтва афармлялася на бланку арганізацыі, якая хадайнічала аб выдачы грошай, як ліст у Цэнтральную Касу. Варта, аднак, звярнуць увагу, што практычна ў кожным дакуменце адрасат, які афармляўся вялікімі літарамі ў цэнтры ліста справа ад назвы арганізацыі, якая дасылала хадайніцтва, быў пазначаны па-рознаму: "У

ЦЭНТРАЛЬНУЮ КАСУ НАЙВЫШЭЙШАЙ БЕЛАРУСКАЙ РАДЫ” [9], “У ЦЭНТРАЛЬНУЮ КАСУ НАЙВЫШЭЙШАЙ РАДЫ Б.Н.Р.”, “ДА ГАЛОЎНАЙ КАСЫ НАЙВЫШЭЙШАЙ РАДЫ” [10], «У ЦЭНТРАЛЬНУЮ КАСУ” [11], “ДА ЦЭНТРАЛЬНАЙ БЕЛАРУСКАЙ КАСЫ” [12], “ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАСЫ НР” [13].

Структура тэкста ўсіх хадайніцтваў прыкладна аднолькавая: спачатку пазначалася падстава для звароту ў Касу (*На аснове ухвалы Найвышэйшае Рады Б.Н.Р. ад 9-га трауня 1920 г. аб выплаце грошай на прадстауніцтва ...* [14]), далей па тэксце пазначалася асоба, якой належала выплаціць грошы, а далей – сума лічбамі і літарамі.

Хадайніцтва падпісвалася згодна з правіламі справаводства арганізацыі, якая яго даслала. Звычайна пасля тэксту пасля водступу ішло найменне пасады, справа ад яго – подпіс. Магчыма прысутнасць пячаткі арганізацыі [15].

Толькі на адным асобніку хадайніцтва ёсць пазнакі прымаючага боку. На хадайніцтве Найвышэйшай Рады БНР перад Цэнтральнай Касай БНР ад 23.06.1920 пад рэквізітамі бланка злева ад тэкста прысутнічае рэзалюцыя: *Выдаць. Я. Лёсік. 24.VI.20.* [16]. Кожны элемент рэквізіта напісаны з новага радка, дата падкрэсленая.

Распіскі за атрыманне грошай з касы пісаліся на друкаваных уніфікаваных бланках памерам 20х12 см. Бланк запаўняўся ад рукі. У правым верхнім вуглу на спецыяльна адведзеным месцы (пазначаным кропкамі) лічбамі падкрэслена пазначалася сума ўзятых грошай і валюта (*40.000 Марак*) [17]. Варта адзначыць, што на бланку для гэтага адводзіліся два полі, з надрукаванымі у канцы літарамі *р.* і *к.*, аднак, паколькі ўсе распіскі былі напісаныя за атрыманне грошай у польскіх марках, то сума пісалася проста паверху гэтых літар.

Далей з невялікім водступам злева надрукавана “Установа” і кропкамі месца для пазначэння. Ніводная распіска не ўтрымлівала, аднак, назву ўстановы.

Ніжэй, вялікімі літарамі шрыфтам значна большым за шрыфт астатніх рэквізітаў цэнтравана напісана “РАСПІСКА.”.

Пад гэтым рэквізітам афармляўся тэкст распіскі, таксама часткова надрукаваны на бланку. Тэкст меў прыкладна наступную структуру (тлустым вылучаны надрукаваныя словы ці іх часткі): ***Места*** *Менск* ***1920 г.*** *чэрвеня 7-га* ***дня, ніжэйпадпісан****ы віцэ-старшыня Беларускай Школьнай Рады* ***выдаў гэту распіску ў тым, што атрымаў ад*** *Галоўнай Касы Найвышэйшай Рады Беларускай Народнай Рэспублікі згодна ордэру Беларускай Школьнай Рады Мінічыны ад 7-VI-920 за №1070* ***пропісью*** *сорак тысяч марак польскіх* ***руб. ... кап., у чым і распісываюся*** *Аркадзь*

*Смоліч* [18]. Поле для пазначэння сумы вылучана гарызантальнымі рыскамі.

Пад тэкстам надрукавана слова *Заплаціў* і поле для пазначэння даты (на распісках не запоўнена). Ніжэй друкам – *Правільнасць выдаткаў пасьведчаю,* і подпіс асобы, выдаўшай грошы (ва ўсіх асобніках В.Іваноўскі). Пад подпісам надрукавана *«Кіраўнік установы»* і месца для пазначэння гэтых звестак, дзе, аднак, ад рукі падкрэслена пазначаўся нумар распіскі.

З аналіза дакументавання дзейнасці Цэнтральнай Касы можна зрабіць выснову, што справаводства ў ёй вялося асобна ад іншых падраздзяленняў Найвышэйшай Рады, аб чым сведчыць афармленае "па ўсіх правілах" (з пазначэннем выходнай даты і нумара, подпісамі старшыні і сакратара, а таксама прастаўленнем пячаткі) хадайніцтва Найвышэйшай Рады аб выдачы грошай. Аб актыўнай рабоце гэтага падраздзялення, а таксама высокім узроўні арганізацыі справаводства сведчыць таксама наяўнасць друкаваных па-беларуску бланкаў і нумарацыя распісак.

Пратаколы сходаў Найвышэйшай Рады, пасяджэння Прэзідыуму Рады БНР, нарады Прэзідыуму Рады БНР і Рады Народных Міністраў БНР аформлены прыблізна аднолькава. На аркушы паперы фармату А4 уверсе цэнтравана разрэджана вялікімі літарамі пазначаецца назва віда дакумента. Пратаколы сходу Найвышэйшай Рады БНР яшчэ і пранумараваны (*П Р А Т А К О Л № І.* [19]), загаловак пратаколу нарады Прэзідыуму Рады БНР і Рады Народных Міністраў БНР напісаны з вялікай першай літары [20].

Пад назвай віда дакумента змешчаны цэнтраваны загаловак – назва пасяджэння і назва калегіяльнага органа (*«СХОДУ НАЙВЫШЭЙШАЙ РАДЫ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ»*) [21]. Загалоўкі пратаколаў сходу Найвышэйшай Рады прапісаныя вялікімі літарамі цэнтравана, пратаколаў пасяджэння Прэзідыуму Рады БНР, нарады Прэзідыуму Рады БНР і Рады Народных Міністраў БНР з раўнаннем па левым краі з пазначэннем даты (*Заседання Прэзідыуму Рады Беларускай Народнай Рэспублікі ад І-го кастрычніка 1920 г.* [22]).

На пратаколах сходу Найвышэйшай Рады БНР пад загалоўкам ў цэнтры правай паловы ліста пазначана дата правядзення пасяджэння. Пад ёй з раўненнем па правым краі пачынаючы са словаў *Прысутнымі былі* пазначаны ў радок прысутныя. Пазначаны толькі імёны (без скаротаў) і прозьвішчы., пасады не пазначаныя.

На пратаколе сходу Найвышэйшай Рады БНР ад 14.12.1919 пад прысутнымі цэнтравана разрэджана падкрэслена пазначана павестка пасяджэння (*П а в е с т к а с х о д у*), пункты якой размешчаны ў

слупок пранумаравана, пад апошнім нумарам пазначана *Павестка прынята аднагалосна.*

Асноўная частка пабудавана па схеме *Слухалі–Пастанавілі* (у пратаколах Найвышэйшай Рады – *Слухалі–Ухвалілі*) асобна па кожным пытанні. Тэксты выступленняў і абмеркаванняў адсутнічаюць. Фармуляр асноўнай часткі падзелены на дзве калонкі: «*Слухалі»* і «*Пастанавілі»*. У першую калонку запісаны пранумараваныя пытанні (*I. Арганізацыйныя пытаньня*), насупраць, у другую калонку – прынятае рашэнне па гэтым пытанні пад тым жа нумарам.

Пратакол сходу Найвышэйшай Рады падпісаны ўсімі прысутнымі, пасяджэння Прэзідыума Рады БНР – маршалкам, намеснікам і сакратаром. Пратакол нарады Прэзідыуму Рады БНР і Рады Народных Міністраў БНР – членамі Прэзідыўма Рады БНР (прадрукавана машынкай разам з назвамі пасад), г.зн. Старшынёй, двума намеснікамі і сакратаром, членамі Рады Народных Міністраў БНР (таксама перадрукавана разам з пасадамі) – Старшынёй, міністрам заграНічных спраў, ніжэй – часовым кіраўніком канцылярыі Рады Народных Міністраў.

На пратаколах сходу Найвышэйшай Рады прысутнічаюць круглыя пячаткі з выявай Пагоні і надпісам *Найвышэйшая Рада Беларускае Народнае Рэспублікі.* На пратаколе нарады Прэзідыуму Рады БНР і Рады Народных Міністраў БНР пячаткі стаяць злева ад прадрукаваных машынкай пасад Старшыні Прэзідыуму Рады БНР, Старшыні Рады Народных Міністраў і міністра заграНічных спраў.

Пратаколы аформлены па-беларуску, стыль – афіцыйна-дзелавы. Прыведзеная форма ўтрымлівае ўсе неабходныя для ідэнтыфікацыі дакумента рэквізіты і дазваляе наглядна зразумець змест і вынікі пасяджэння.

Выпіскі з пратаколаў аформлены па тых жа правілах, як і самі пратаколы, аднак ад рукі. У загалоўку па цэнтры аркуша пазначана назва віда дакумента (*Выпіска з пратаколу № 11 сходу Найвышэйшае Рады Беларускае Народнае Рэспублікі* [23]), пад ёй – дата, ніжэй – прысутныя. Пасля асноўнай часткі, аформленай як і ў саміх пратаколах табліцай *слухалі–ухвалілі*, але толькі па адным пытанні, пазначалася, хто падпісаў арыгінал (*На арыгінале подпісы:*). Ніжэй пазначалася «*З арыгіналам згодна:* і далей пасада і подпіс таго, хто заверыў. На выпісках з пратаколаў сустракаюцца пячаткі арганізацыі.

Звяртае на сябе ўвагу выпіска з пратакола № 2 пасяджэння Найвышэйшай Рады БНР ад 16.12.1919 [24]. Выпіска аформленая на бланку Найвышэйшай Рады і па-французку, аднак размяшчэнне

рэквізітаў адпавядае беларускамоўным асобнікам.

Упаўнаважанне Найвышэйшай Рады БНР [25] Антону Луцкевічу весці перамовы з іншымі ўрадамі афармлена рукапісна на двух аркушах А4 – па-французку і па-беларуску. Зверху ў цэнтры ліста цэнтравана падкрэслена пазначана назва віда дакумента. У тэксце, размешчаным пад назвай, пазначана рашэнне, якое стала падставай для напісання ўпаўнаважання, пазначана ўпаўнаважаная асоба, а таксама даецца спіс паўнамоцтваў. Дакумент падпісаны Старшынёй Найвышэйшай Рады і сакратаром (*за сакратара Намеснік Старшыні*). Дакумент пацверджаны пячаткай з выявай Пагоні і тэкстам *REPUBLIQUE DEMOCRATIQUE BLANCHE-RUTHENIENNE*. Ніжэй злева пазначаны месца складання і дата (*Менск, 15 студзеня 1920.*). Французскамоўны асобнік адрозніваецца тым, што напісаны на бланку Найвышэйшай Рады (у левым верхнім вуглу цэнтравана надрукавана вялікімі літарамі *БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ РЭСПУБЛІКА*, ніжэй большым шрыфтам *НАЙВЫШЭЙШАЯ РАДА*, яшчэ ніжэй тое самае надрукавана па-французску).

Грамата Найвышэйшай Рады БНР Б. Тарашкевічу афармлена рукапісна на аркушы А4 па тых жа правілах, як і беларускамоўны варыянт упаўнаважання А. Луцкевічу. Пэўную асаблівасць аднак складае пазначэнне месца складання дакумента – пасля подпісаў Старшыні і членаў Найвышэйшай Рады злева у слупок пазначана: *«Дана ў Вільні 19 студзеня 1921 року №11.»* [26]. Дата і нумар адпаведна напісаныя з новага радка.

Хадайніцтва Найвышэйшай Рады БНР перад Цэнтральнай Касай БНР афармлена машынапісам на аркушы А4. У левым верхнім вуглу цэнтравана размешчаны рэквізіты бланка – назва арганізацыі (*НАЙВЫШЭЙШАЯ РАДА БЕЛ.НАР.РЭС*), пад ёй дата, ніжэй выходны нумар і месца складання дакумента. Кожны рэквізіт, як і словы *РАДА* і *БЕЛ.НАР.РЭС* афармлены з новага радку. Дзень месяца і нумар пазначаны ад рукі. Справа, на ўзроўні слова *РАДА* пазначаны адрасат – *У ЦЭНТРАЛЬНУЮ КАСУ*. Ніжэй, на ўзроўні выходнага нумара з таго самага водступа, што і адрасат, пачынаецца тэкст. Структура тэкста тыповая для хадайніцтва – падстава для выдачы грошай, асобы, якім неабходна іх выдаць і пэўныя асаблівасці выдачы. Тэкст афармлены з вялікага водступу злева такім чынам, каб месца пад рэквізітамі бланка захоўвалася пустым. Хадайніцтва падпісана Старшынёй і сакратаром. Замацавана пячаткай Найвышэйшай Рады.

Машынапісны суправаджальны ліст Прэзідыуму Рады БНР Старшыні Рады Народных Міністраў БНР В. Ластоўскаму ад 9.10.1920

аформлены па тых жа прынцыпах, што і хадайніцтва Найвышэйшый Рады ў Цэнтральную Касу. У левым верхнім вуглу размешчаны рэквізіты бланка – назва арганізацыі, выходны нумар, дата і месца складання дакумента – справа ад іх пазначаны адрасат, пад адрасатам – тэкст. З тэкста ліста зразумела, што разам з ім дасылалася копія пратакола пасяджэння Прэзідыума Рады БНР ад 1 кастрычніка 1920 г., што аднак не аформлена нейкім асобным рэквізітам. Гэта дае падставу меркаваць аб адсутнасці ў разглядаемы перыяд такога рэквізіта як пазнака аб дадатку. Ліст падпісаны Маршалкам Рады і сакратаром. Пячатка адсутнічае.

Звяртае на сябе ўвагу даручэнне Прэзідыума Рады БНР прадстаўніку БНР у Рэвелю А. Маркевічу весці перамовы з прадстаўнікамі РСФСР. У адрозненні ад дакументаў, якія ўжо разглядаліся, яно аформлена на друкаваным бланку, размяшчэнне рэквізітаў якога мае пэўныя адрозненні ад суправаджальнага ліста Прэзідыуму Рады БНР Старшыні Рады Народных Міністраў БНР В. Ластоўскаму. Так, спачатку надрукавана назва арганізацыі – *Рада Беларускай Народнай Рэспублікі.*, ніжэй - назва падраздзялення – *Прэзыдіум.*. Пад назвай падраздзялення меньшым шрыфтом прапісана назва арганізацыі ўжо па-французку. Пад ёй кропкамі пазначана месца для чысла і месяца, надрукавана *«192...»*, яшчэ ніжэй пасля надрукаванага сімвала «№» адведзена месца для пазначэння выходнага нумару.

Адрасат і тэкст аформлены згодна з тымі самымі прынцыпамі, што і астатнія выходныя дакументы Рады. Даручэнне падпісана Старшынёй і сакратаром, замацавана круглай пячаткай з выявай вершніка (Пагоні) і надпісам па коле *РАДА БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ.*

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што для асноўных відаў дакументаў, такіх як пратаколы пасяджэнняў, выпіскі з пратаколаў, упаўнаважанняў і грамат, а таксама лістоў, якія ўтвараліся ў выніку дзейнасці Рады БНР і яе падраздзяленняў ў 1919–1921 гг. існаваў распрацаваны фармуляр, што аднак не перашкаджала прысутнасці пэўнай варыятыўнасці ў афармленні асобных рэквізітаў. Устойлівы распрацаваны фармуляр дазваляў беспамылкова ідэнтыфікаваць дакумент. Для перыяду 1920–1921 гг. характэрны шырокае распаўсюджанне пячатак і бланкаў розных падраздзяленняў, устаноў і нават пасадаў, што таксама не перашкаджала існаванню паралельна з імі дакументаў як машынапісных (іх – большасць), так і рукапісных.

## Крыніцы і літаратура:


1. ЛЦДА. ф.582, воп. 2, спр.56.
2. Там жа, воп. 1, спр. 04. лл. 01, 19, 20.

3. Там жа, воп. 2, спр.39, л.4.
4. Там жа, воп. 2, спр. 39, л. 13., спр.37, л. 57.
5. Там жа, воп. 2, спр. 39, лл. 14-16, 29-36.; НАРБ, ф. 365, воп. 1, спр. 46, л. 119.
6. ЛЦДА, ф. 582, воп. 1, спр. 4, лл. 16-17.
7. Там жа, воп. 2, спр. 37, л. 70.
8. Там жа, л. 96.
9. Там жа, л. 59.
10. Там жа, л. 55.
11. Там жа, л. 71.
12. Там жа, л. 62.
13. Там жа, л. 76.
14. Там жа, л. 71.
15. Там жа.
16. Там жа.
17. Там жа, л. 54.
18. Там жа
19. Там жа, ф. 1, спр. 4, л. 20.
20. Там жа, ф. 2, спр. 54, л. 121.
21. Там жа, ф. 1, спр. 4, л. 20.
22. Там жа, ф. 2, спр. 54, л. 439.
23. Там жа, ф. 2, спр. 39, л. 18.
24. Там жа, ф. 2, спр. 37, л. 57.
25. Там жа, ф. 1, спр. 4, лл.16-17.
26. Там жа, ф. 2, спр. 37, л. 70.